# АНАТОЛЬ МАКСІМАВІЧ ДАРАФЕЕЎ. ЧАЛАВЕК. АСОБА. ГРАМАДЗЯНІН. НАТАТКІ ПРА ЖЫЦЦЁ І ДЗЕЙНАСЦЬ НАВУКОЎЦА, ЯКІ ВЕДАЎ САПРАЎДНУЮ ЗНАЧНАСЦЬ УНІКАЛЬНЫХ ПРЫРОДНЫХ СІСТЭМ ПААЗЕР'Я

*С. Дзядзінкіна*
Віцебскі аблвыканкам

Анатоль Максімавіч Дарафееў. Выдатны навуковец, настаўнік, эколаг, грамадскі дзеяч, публіцыст, краязнаўца, сапраўдны абаронца навакольнага асяроддзя. Цудоўны таварыш, сябр, калега, муж, бацька, дзядуля… Сапраўдны патрыёт сваёй краіны, шчыры беларус, які з асаблівай павагай ставіўся да нацыянальных традыцый, роднай культуры, мовы.

Репозиторий ВГУ

Ён быў заўсёды на перадавых пазіцыях свайго часу. Актыўны рупліўца не праходзіў міма нават звычайных дробязяў, з якіх складаецца наша жыццё. Найвыдатнейшы арганізатар, пакінуў значны след у грамадскім і навуковым жыцці Прыдзінскага краю. Многія справы, ініцыятарам якіх быў А.М. Дарафееў маюць працяг і сёння – будзь то ўдасканаленне сеткі прыродаахоўных тэраторый Беларускага Паазер'я, ці напісанне краязнаўчых нарысаў пра родныя гарадоцкія мясціны. Ён умела і з прысутной толькі яму легкасцю ладзіў навукова-практычныя канферэнцыі, краязнаўчыя чытанні, экспедыцыі, многія з якіх мелі статус міжнародных. І ўся гэта кіпучая дзейнасць была падпарадкавана адзінай мэце апантанага эколага – захаванне біялагічнай разнастайнасці прыроднага асяроддзя.

Нарадзіўся Анатоль Максімавіч Дарафееў у вёсцы Лажані Гарадоцкага раёна ў 1941 годзе ў сялянскай сям'і. Назву кожнай вёсачкі са сваёй малой радзімы называў адразу і з задавальненнем: Загорцы, Шляхты, Хобня, Зуі, Бодяі, Куксы, хаця яны ўжо даўно не існуюць. Асобны след у яго выхаванні пакінуў дзядзька Георг Пятровіч Каразееў. Сваімі настаўнікамі ў навуцы А.М.Дарафееў называў заснавальнікаў экалагічнай школы Пааз'ер'я Анатоля Іванавіча і Усевалада Анатольевіча Радкевічаў, Аляксандра Паўлавіча Крапіўнага.

У 1980-я гады Віцебскі педагагічны інстытут вядомы ў краіне (СССР) па адметнай арніталагічнай школе. У той час А.М. Дарафееў – прарэктар па навуковай рабоце імкнуўся, каб здабыдкі навукоўцаў былі вядомыя не толькі ў вузкім навуковым коле, але і шырокай грамадскасці. Яго дзейнасць спрыяла папулярызацыі біялагічнай навукі. Журналісты маглі звярнуцца да прарэктара з любым пытаннем і атрымаць вычарпальную карысную інфармацыю. Адкрытасць навукоўца і яго разуменне важнасці папулярызацыі праблем аховы навакольнага асяроддзя зрабілі яго надзвычай папулярным сярод творчай інтэлігэнцыі Віцебшчыны, і нават далека за межамі вобласці.

У 1989 годзе ў Віцебску прайшла першая гарадская экалагічная канферэнцыя. Рыхтаваліся да яе грунтоўна, з Акадэміі навук Беларусі запрасілі геахімікаў для стварэння экалагічнай карты горада. Анатоль Максімавіч прымаў непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні канферэнцыі. Па яго ж ініцыятыве тады ж і былі аб'яднаны абаронцы навакольнага асяродку басейна Балтыйскага мора – актывісты з Расіі, Беларусі, Латвіі ў адзіны рух "Дзвіна – Даўгава". Добрыя стасункі паміж эколагамі і моладдзю Віцебска, Даўгапілса і Рыгі развіваліся, мелі перспектыву.

У 1990-м годзе А.М. Дарафеева прызначаюць на пост старшыні Дзяржкамітэта па экалогіі Рэспублікі Беларусь. Пры ім адбываецца замена тэрміна у назве структуры – з аховы прыроды на экалогію. На той час у краіне распрацоўвалі новы пакет прыродаахоўных законаў,



Репозиторий ВГУ

Мінск стаў месцам пастаяннай працы выканаўчага сакратарыяту Міждзяржаўнага экалагічнага савета. Кіраўнік экалагічнага ведамства ўдала праводзіў дыялог з палітычнымі партыямі і грамадскімі арганізацыямі, заўсёды імкнуўся знайсці канструктыўнае выйсце з любога складанага становішча. Работа ва ўрадзе дала магчымасць для цікавых сустрэч, карысных паездак па свеце. Беларусь удзельнічала ў буйнешай міжнароднай канферэнцыіі ААН, прысвечанай навакольнаму асроддзю і развіццю, што адбылася ў Бразіліі ў 1992 годзе. У той знакавай канферэнцыі прынялі ўдзел кіраўнікі 160 дзяржаў. Беларусь атрымала бязвыплатны грант на суму 1 мільён даляраў ад Міжнароднага валютнага фонду на захаванне біялагічнай разнастайнасці. А.М. Дарафееў з асаблівай увагай і клопатам ставіўся да захавання нацыянальных ахоўных тэрыторый. Створаная сетка ўнікальных прыродных мясцін Беларусі патрабавала пастаяннага маніторынгу і развіцця. І як кіраўнік ведамства, і як вучоны Анатоль Максімавіч рабіў дзеля гэтага ўсё магчымае.

Напрыклад, у Віцебскім раёне з удзелам біёлагаў Віцебскага дзяржуніверсітэта былі створаны заказнікі "Чортава Барада", у пойме ракі Шэвінка "Прыдзвінне", "Дымаўшчына" і інш .

А.М. Дарафееў з аднолькавым імпэтам праводзіў навукова-практычныя канферэнцыі не толькі ва універсітэцкіх сценах, але і ў далёкіх ад гарадской цывілізацыі вёсках. Прыгадваецца канферэнцыя ў Гарадоцкім раёне на базе Вярэчцкай школы, прысвечаная экалогіі возера Ціоста. Навукоўца на працягу 40 год назіраў за экалогічным станам Ціоста. Прыйшоў да высновы, што навакольнае асяроддзе ў межах возера істотна змянілася за апошнія дзесяцігоддзі. Спецыфічны гідралагічны рэжым, унікальнасць ландшафтаў, іх маляўнічы характар, шматлікасць рэдкіх і знікаючых відаў раслін і жывёл – усё гэта патрабавала ад эколагаў працягваць вывучэнне стану антрапагеннага ўздзеяння на экасістэму возера. Ён ведаў назву кожнага вострава, якія як свечкі ўзвышаюцца над водным люстэркам, і гісторыю кожнай археалагічнай знаходкі, што тут адбываліся. Ліпнік, Царкавішча, Гарадзішча, Асінавы, Гасцінец, астравы Небяспекі.

– Год 15 таму рыбакі лавілі сеткамі рыбу і выцягнулі з дна вянчальную карону, – распавядаў Анатоль Максімавіч. – На беразе возера калісьці стаяла царква, а зараз на ім "джунглі" папараці. Вёскі ў наваколлі вымерлі, тутэйшых насельнікаў амаль не засталося.

Апошнія гады А.М.Дарафееў прысвяціў шэраг сваіх даследванняў вывучэнню азернай спадчыны Прыдзвінскага краю. Сфера яго прафесійных інтарэсаў з гадамі пашыралася, ён усё глыбей вывучаў сістэмы азёр і верхавых балот Віцебшчыны, тым самым падкрэсліваючы, што арнітафауна сама па сабе не захаваецца, калі не захоўваць прыродныя ландшафты цалкам.

Репозиторий ВГУ

Напрыканцы 1994 года А.М. Дарафееў займае пасаду першага прарэктара Віцебскага дзяржуніверсітэта. ВНУ штогод праводзіць уплывовыя міжнародныя навуковыя канферэнцыі, прысвечаныя шэрагу актульных праблем сучаснасці.

З імем Дарафеева можна звязаць і вяртанне сучаснікам памяці пра слыннага земляка класіка беларускай літаратуры Яна Баршчэўскага. З фатасмагарычным аповедем "Шляхціц Завальня" беларусы ўпершыню пазнаёміліся ў 1990-м годзе, калі твор быў выдадзены ў серыі "Спадчына". Прачытаўшы кнігу, якая была забытая на працягу амаль паўтара стагоддзя, А. М.Дарафееў арганізаваў першую комплексную навуковую экспедыцію на радзіму класіка ў Расонскі раён.

– Упершыню я наведаў мясціны Я. Баршчэўскага ў маі 1990 года: пабываў у Мурагах, на Люцькаўскім востраве, на паўднёвым узбярэжжы мурагоўскага плёсу Нешчарды, – пісаў ён у сваім дзённіку. – Але так і не сустрэў нікога з мясцовых жыхароў, хто б мог хоць штонебудзь расказаць пра сядзібу шляхціца Завальні. Вёска Мурагі ўсхвалявала памяць пустэчамі знікшых сядзіб, здзічэлымі садамі, зруйнаванымі могілкамі. Там, дзе некалі стаяла царква, пракладзена новая дарога. Вось яно – бяспамяцтва, здзеклівыя адносіны да гісторыіі. Між іншым творы Баршчэўскага сведчаць: родны край багаты на легенды і паданні.

Першыя літаратурныя чытанні, прысвечаныя Я. Баршчэўскаму, адбыліся ў старажытнай вёсцы Гарбачэва Расонскага раёна. Тады ж адкрылі і першы памятны знак у гонар песняра – валун з выбітым барэльефам, устанавілі на ўездзе ў Мурагі.

– Сядзіба Завальні месцілася на пагорку ў паўсотні метрах ад возера, – пісаў Анатоль Максімавіч у сваім дзённіку. – Відаць, як некалі тут бульдозерам ссунулі камяні падмуркаў. Пад ногі трапляла шкло і нават рэшткі глінянага і фарфоравага посуду. Метраў за трыста ад сядзібы на захад працякае рэчка, акурат як у творы Я. Баршчэўскага. Дарога з Мурагоў па зімоваму возеру Нешчарда праходзіла непадалёку ад Завальні, і таму яго ліхтар або свечка ў час завеі аказвала добрую блукаючым падарожнікам.

Энтузіязму Дарафеева хапала, каб літаратурныя чытанні праводзіць рэгулярна, запрашаючы на іх літаратуразнаўцаў і пісьменнікаў з замежжа.

Адметны след пакінуў навукоўца і ў захаванні літаратурнай спадчыны Гарадоччыны. З яго імем звязана адкрыццё памятных знакаў, прысвечаных паэме "Тарас на Парнасе". У снежні 2001 года ў Гарадку адбылося сапраўднае "ўзыходжанне на Парнас памяці". Цудоўна падрыхтаваная імпрэза ператварылася ў народнае свята з жартамі і песнямі.

У сталым узросце Дарафееў часта працаваў у архівах, збіраючы матэрыял пра сваю малую радзіму, устанавіў радаслоўную да чацвертага калена. Краязнаўства было для яго не проста найвялікшым захапленнем – жыццёвым крэдам.

З 2002 года дацэнт Анатоль Максімавіч Дарафееў, аўтар больш за 120 навуковых прац, загадвае кафедрай экалогіі і аховы прыроднага асяроддзя Віцебскага дзяржуніверсітэта імя П.М. Машэрава. Сярод любых ландшафтаў ён адчуваў сябе камфортна, за ўсім назіраў і кожны дзень заканчваў дзённікавымі запісамі. Асабістыя экалагічныя дзённікі Анатоль Максімавіч вёў з 1955 года. Сабраў багаты матэрыял у 115 нататніках. Яго прыцягвалі тайны жывой планеты і засмучала безабароннасць прыроды, збядненне экасістэм, асушэнне балот…

– Я вывучаю Віцебшчыну са студэнцкіх гадоў, з канца 1950-х, многа дзе пабываў з даследчымі мэтамі, – сказаў у адным са сваіх апошніх інтэрв'ю Анатоль Дарафееў. – Магу сказаць, у нас захаваліся ўнікальныя комплексы. Я ўражаны арыгінальнасцю і непаўторнасцю балота Ельня, хараством ушацкіх азер, суражскага леса-азёрна-балотнага комплекса, унікальнасцю мясцоваці ў вярхоўях ракі Дрысы…

Мы павінны ганарыцца і берагчы гэтыя тэрыторыі, дзе прырода дастойна таго, каб яе ухвалялі і ганарыліся.

Репозиторий ВГУ